БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29
...рэс: Адміністрацыі Захароуская
«Юбілейны Дом».

...эдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
...дміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

...эдакцыя пакідае за сабой права па-...рауляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб.
на апошняй —50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 95. Менск. Пятніца 16 жніўня 1918 г. Год 1

Братняя ліцітацыя Беларусі.

Шэсць месяцоу мінуло ад ...су падпісання міравое угоды ...к Расійскаю Савецкаю Рэспублікаю і Цэнтральнымі ...ржавамі, згодна якой па...на была быць складзена у ...мым хуткім часе і міравая ...ода Украіны з Вялікаросіяй.

Шэсць месяцоу прайшло ад ...шае публічнае ліцітацыі Беларусі, зробленае у імя «самавызначэння народау» людзьмі, ...йбольш аб гэтым крычаушымі.

Але, разгромленая пад той ...с Беларусь, ні меушая сіл ...звацца самадзельнай, нізалежнай, ні магла гэгай ліцітацыі ...м, у Бярэсьці, ні дапусьціць. ...магла бараніць сябе праз ...іх прадстаунікоу, бо «власть ...ущіе» праніунікі «таемнае ...пломацыі», карыстаючы с то..., што на іх баку была сіла. ...прапусьцілі Беларускіх дэ...гатау церас фронт.

Звольненая-ж ад уціску ...свабадзіцельных» бандау з ...аскоушчыны Беларусь, пачаушая у сабе сілу і пазнаушая ...начэнне моманту—стала нізалежнай, аб чым і былі апа...шчаны усе гасударствы.

І ось Маладая Беларуская ...эспубліка, добра разумеючы ...начэнне будучаго моманту міравых перагаворау Украіны з ...лікаросіяй, перш за усе па...лала сваю дэлегацію у Кіеу ...а Маладое Украінскае Рэспублікі, каб, устанавіушы ...зяржаупую мяжу між дзьяржавамі двух братніх народау, ...накова цярпеушых ад Расійскаго «самадзержавія» і веу...ых супольную працу у справе свайго адраджэння, суполь...а выступіць для укладання ...моу з Вялікаросіяй.

Але прадстаунікі Украіны, ...перших же дзен беларуска-...краінскіх перагаворау пачалі ...азьбіваць Беларускую веру у ...раудзівую прыхільнасьць да ...ак важнае для абоіх народау ...ацыянальна - этнаграфічнае ...правы.

Пінскі, Мазырскі, Рэчыцкі ...эльскі паветы з артэрыяй Беларускаго арганізму—Прыпяцью і с чугункай Пінск — Гомель, а так сама паветы: Мглінскі, Суражскі, Старэдубскі, Новазыбкаускі і частка Городнянскаго павету Чарнігаушчыны, а такаж частка Гродзеншчыны—сталі каменям спатычкі пры перагаворах Беларусі і Украіны аб мяжы.

Палітыкі Маладое Украінскае Рэспублікі, забыушы, на вялікі жаль, аб гістарычных традыцыях і братэрстві двух народау, захопленыя імпэрыялістычнымі тэндэнцыямі пачалі будаваць Вялікую Украіну і перш усяго за кошт братняго Беларускаго народу.

І хоць у апошнія хвіліны жыцця соцыялістычнаго габінэту п. Голубовіча пытанне аб мяжы, здавалася, траціло свой востры характар і беларуска-украінская мяжа, быць можа, зафіксавалася б блізка да этнаграфічнае, але... здарыуся пераварот...

Новая улада-урад Украінскае Дзьяржавы у беларуска-украінскім пытанню пачала ад заверэнняу Беларускае дэлегацыі у сваіх сымпацыях і падтрымцэ Беларусі.

Аднак жа работа гэтае улады далека адышла ад словау. Атказаушы Беларускай дэлегацыі у магчымасьці рабіць які—нібудзь уплыу на ход міравых перагаворау між Украінаю і Вялікаросіяй, датычных жыццевых інтарэсау Беларусі—яе мяжы, Украінская міравая дэлегацыя з главенствам ні «обшероссов», а праудзівых украінцау сьмела прыступіла да торгу с Савецкаю уладаю за кошт безспрэчных зямель Беларусі, ні даушы нат магчымасьці яе прадстаунікам выказаць хоць-бы патрэбныя тлумачэння.

Характэрна, што украінцы проці допуску беларускіх прадстаунікоу на Кіеускія міравыя перагаворы выстаулялі акурат такія ж аргументы, якія праводзілі большэвікі на міравых перагаворах у Бярэсьці проці допуску прадстаунікоу Украіны.

Гэткім чынам пачалася другая публічная ліцітацыя Беларусі—Кіеуская—ішчэ страшнейшая чымся першая—Берасьцейская—як па сваей гістарычнасьці, так і па тому, што ліцітацыя робіцца ад імяні братняго з давен-дауна дружняго Украінскаго Народу.

Ну, што-ж, хутчэй канчайце гэтую «братнюю» публічную ліцітацыю Беларусі—таргуйцеся, раздзірайце жывое цело братняго народу беларускаго на часьці. гэта тым лягчэй зрабіць, што гандаль гэты вам прыходзіцца весьці ні з уласьнікам гэтых зямель —Беларускім народам у асобе яго ураду, а толькі з людзьмі нагла захапіушымі у імя «самавызначэння народау «чужыя землі і вынясшые іх на «толкучку».

Што-ж, канчайця хутчэй гэту ліцітацыю, цяпер Ваш час. але памятайце што колькі бы вы ні раздзіралі і ні прадавалі Беларусь, яна жыве і будзе жыць!

І ці ні будзе гэта часам, у самай рэчы, заместа ліцітацыі Беларусі толькі ліцітацыя братніх старых гістарычных беларуска-украінскіх узаемаадносін, гэтак дарагіх і важных як дзеля Беларусі так і дзеля Украіны?!

Я. Юзюкевіч.
«Б. Эхо».

На беларускім шляху.

КІЕУ.

Справы уцекачоу.

— Пастановай краевай Нарады, зацьверджанай Бежанскім Дэпартамэнтам, ад 2 ліпня г. г. спынена выдача паяк уцекачам на харч і кватэру с прычын цяжкаго фінансаваго становішча Украінскай дзержавы і пачатку рэвакуацыі.

— Кіеускім Беларускім Камітэтам помачы уцекачом падана прозьба нямецкім і украінскім уладам аб дазваленні склікаць агульны сход беларусау уцекачоу, якія жывуць у Кіеві і ваколіцах для парады над пытаннямі рэвакуацыі.

— Праз апошнія дні па заступніцтву Беларускаго Камітэту помачы уцекачом, атрымалі ад нямецкіх уладау пропускі і выехалі у Менскую, Гродзенскую і інш. губ каля 100 сямей уцекачоу—беларусау.

— Бежанскім Дэпартамэнтам пярэданы Беларускаму Камітэту помачы уцекачом баракі для уцекачоу з лазьней і пральняй бялізны, якія знаходзяцца на Набярэжна-Луговай вуліцы.

«Бѣлорусское Эхо».

Кіеуская беларуская газэта «Бѣлорусское Эхо» рэформавалося і выходзіць цяпер у формаце тыднеvіка «Вольная Беларусь», выходзячаго у Менску—у чвертку. Выгляд часопісі ад зьмены формату зрабіуся прыгожэйшым. У значна пашырэным беларускім аддзелі друкуецца у апошніх №№ студиюм Ю. Ф—кі «Літэратура і жыцце.

Адэса.

Агульным сходам уцекачоу-беларусау пастаноулено усе справы Адэскаго Камітэту помачы уцекачоу перадаць у рукі новаго прауления камітэту аб чым паведаміць атамана м. Адэсы Беларускі Нацыянальны Камісарыят і Бежанскі Дэпартамент.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН 12 гм. Урадова 11 жніўня перад поўднем нашы разведачныя самалёты абсажаныя па Фрызыйскіх атаках і паветраны карабель на поўначы ад Фрыляндa убачыўшы значныя ангельскія марскія сілы, якія складаліся найменей з 25 ліпейных караблёў, 6 крэйсэраў і вялікай лічбы контр-мінаносцаў і мінаносцаў. Яны вялі з сабой самаходных лодак, якія, відаць, назначаліся да закладання мінаў. Часьці ангельскаго флоту пасуваліся у кірунку Нямецкай затокі.

Нашы самалёты і дырыжаблі зараз жа зрабілі атаку с помачу бомб і кулямётаў на самаходныя лодкі і мінаносцы.

Ім удалося знішчыць тры самаходныя лодкі і зрабіць нігодными астальныя. Апрача гэтаго бомбы трафілі у адзін с крэйсэраў і у адзін мінаносец, каторы быў так ушкоджаны, што скора яго убачылі топячымся. Нашыя морскія баевыя сілы, якія выступілі зараз-жа на мейсцо бою ні маглі дагнаць пачаўшаго уцекаць праціўніка. Нашыя страты: 1 дырыжабль пад камандай капітана Кроэльса і 1 самалёт. Пры адпоры і атацэ асабліва адзначыліся паветраныя флотыліі з Боркум і Нордэрней пад начальствам лейтэнанту флоту Фрэйндбэрга і Гоммэрса.

Шэф адміралтэйскаго штабу Мараходства.

БЭРЛІН 12 гм. Урадова. Быўшыя тутака у працягу астатніх тыдняў перагаворы з расійскімі дэлегатамі аб дадатках да берасьцейскіх трактатаў у справе палітычных, эканамічных фінансавых і праўных пытанняў, цяпер да пэўнаго стопню закончаны. Тутэйшы прадстаўнік расійскаго ураду саветау Іоффэ разам з несколькімі расійскімі дэлегатамі выехаў на пару дзен у Маскву, каб зрабіць тамака справаздачу аб скутках перагавораў і як мажліва хутчэй дабіцца рашэння свайго ураду.

ВАРШАВА. «Stos» піша, што польская рада міністраў пастанавіла прасіць нямецкія ўлады прыняць такія самыя спосабы да абароны інтэрэсаў польскіх падданых у Расіі, якія былі прыняты у інтарэсах нямецкіх падданых.

ШТОКГОЛЬМ. Арэшты ахвіцэраў залічаных у чырвоную гвардзію ідуць далей. Высьнілося, што ахвіцэры хацелі перахіліць на свой бок чырвонагвардзейцаў і угаварываць іх перайсьці у часе бою на бок непрыяцеля. Шмат арыштаваных разстэляна.

З Украіны.

КІЕУ 14/VIII. Гэтманам зацьверджэны склад дзержаўнаго сэнату. Сэтатарамі назначаны у большасьці члены даўнейшаго расійскаго дзержаўнаго сэнату.

— Камісія па апрацаванню

праэкта закону аб украінскай акадэміі навук пастанавіла, каб адна катэгорыя навуковаго складу акадэміі выбіралася аддзеламі з рэкамэндацыі загадчыкоў аддзеламі на штатныя пасады на даўжэйшы час, другая на тры годы. Аб праве Акадэміі выдаваць вучоныя стопні пастаноўлено, што Акадэмія мае право надаваць званне доктара «honoris causa», аддзелы маюць право ўзводзіць на той-жа стопень і арганізаваць дыспуты.

— Камісія акад. В. І. Вернадскаго прыняла глаўнейшыя артыкулы праэкта права аб арганізацыі у Камянцы-Падольскім дзержаўнаго украінскаго унівэрсытэту у складзе чатырох факультэтаў. Унівэрсытэт будзе карыстаццa такімі прывілеямі, якія былі у расійскіх унівэрсытэтах.

«Бѣл. Эхо.»

КІЕУ. Міністр вагранічных спраў, Дарошэнко, быў у нямецкаго глаўнакамандуючаго на Украіне, гр. Кірхбаха, заявіушаго што ён так сама, як і яго прадмесьнік Ейхгорн будзе працаваць дзеля ўмацавання нізалежнасьці Украіны. Забастоуку на украінскіх чыгунках можна лічыць закончэнай.

Ва усіх сярэдніх школах паводлуг спэцыяльнаго закону уводзіцца прымусовая навука украінскай мовы, украінскай гісторыі і географіі.

КІЕУ. Міністэр спажывацкіх спраў, Сакалоускі, падаўся у адстаўку. На яго месцо назначэн Горбэль.

Уражэнні.

IV *).

Мімавольна, спатыкаючы на кожным кроку родную красу, воко пачынае прызвычаівацца. Супакоіваюцца пачуцця і думкі шукаюць новай рэчы па якой бы запыніцца.

Усё проста і проста лагчынамі і узгоркамі і роўнай раўнінаю бяжыць шырокі гасьцінец... Беларусь, Беларусь! Каб такім простым і лёгкім для паходу быў твой гістарычны шлях! Дзе-б апынулася ты цяпер з сваім працавітым, гаспадарным, любячым асьвету, народам? Хто-б угнаўся за табой у усесьветным поступе? Хіба далёка! Хіба што ніхто! А цяпер ляжыш ты на лоне сваёй мацяры-зямлі німоцная, кволая. Ні шляхі, а глыбокія разоры пралажаны на тваім жывым целе і ні відаць часу таго, калі яны пагояцца. Ні суджона табе было жыць і квітнуці для сябе. Колькі разоў баламуціўся спакой палёў тваіх і урочая ціша лясоў браганнем зброі і крыкамі здрывеўшых вояў? Ні перастаралі курыць неба твае дарогі і гасьцінцы. Ганяліся па іх лямскія гуфцы, ветрам скідаліся татарскія загоны панура запушчанымі у коні і у людзей галавамі у скураных латах праеждждалі шведы, пасьпешалі на свае мейсца у залачоных магнацкі бэрлінах, духоўныя дыплёматы Польшчы, энэргічныя о. о. езуіты, імчаліся у скарбовых брыках кур'еры «матушкі» Капярыны і... сколькі іншэ.—«Усё прамільгнула перад намі, усе пабывалі тут». І ні толькі дарогі твае убівалі. Беларусь, але і народ твой забілі па самы падол жыцця затапталі у ім нахадзэнне Боскае і годнасьць чалавечую, капытамі жыватоў сваіх пабілі усе яго прывілеі на гэто, як шкадлівы статак дапушчаны сквапным ніпраўдзівым суседам пабірае га падарскую рунь... Так было.

І. Жывіца.

*) Гл. №№ 88, 90, 91.

Заметка з газэт.

Спіс прыказау і загадау аб вешчае аб з мені § 3 загаду Пазычковай Кассы на Усходзі ад 16 студня 1918 году. Паводлуг весткі Пазычковая Касса на Усходзі мае право ад гэтаго часу выдаваць вядомыя ужо «Darbhuskassenscheine» (нямецкія рублі) маркамі. білетамі на $^1/_2$,2,5,100 і 1000 мар. Выпуск новых крэдытак пачнецца у канцы жніуня. Найперш маюць быць пушчаны у ход 50 марковыя крэдыткі. У працяг 8-мі бліжэйшых тыдняу будуць выпушчаны усе другія крэдыткі з выключэннем 1000 марковых, дзеля таго, што на іх прыгатауленне трэба яшчэ колькі часу.

Крэдыткі, дэталічнаго апісанне каторых будзе пададзена дзеля агульнаго ведама, розніца ад старых крэдытак тым,

1. што яны маюць быць выданы у марках,

2. што мейцо выдання іх ні есьць болей «Ost Bank fur Handel u. Gewerbe» (Ускодні Банк для Гандля і Прамыслу), а «Darlehunskasse Ost» (Пазычковая Касса на Усходзі), каторая у свой чарод ад 1 студня 1918 году лічыцца установай нямецкаго гасударства,

3. крэдыткі на пярэдняй старане маюць такую заметку, каторая служыць заверэннем гаранціі гасударства нямецкаго; у ей стаіць: «Выкуп крэдытак пазычковай кассы Ост у номінальнай вартасьці гасударственнай маркі забяспечан нямецкім гасударствам».

Наагул 5,20,50 і 100 марковыя крэдыткі падобны да ужываных дагэтуль 3.10,25 і 100 рублевых крэдытак, аднак розніца у тым, што 5 марковыя утрымліваюць сіні, а 100 марковыя зялены колер, каб ні было магчыма змешываць з 3 і 100 рублевымі крэдыткамі. Для $^1/_2$, 1 і 2 маркавых крэдытак выбраны зусім новы узор, крэдыткі усе будуць пад нумэрамі.

Выпуск новых маркавых крэдытак Пазычковай Кассай у валютным аднашэнні ніякіх зьмін мець ні будзе. Ужо загадам ад 30 мая 1917 г. была апавешчана гаранція гасударства нямецкаго аб выкупе грошай па 2 маркі; ад таго часу грошы obost ні лічыліся болей у валюце рубля, але у валюце маркі, гэта значэ, што курс грошай залежыць ні ад курсу рускаго рубля, а ад курсу нямецкай маркі. Аднак тая акалічнасьць, дзе гэтыя грошы насілі назву рубля і на самых гэтых білетах ні было гасударственнай гаранціі, паслужыло прычынай нілічэнных нідаразуменняу, а так-сама і нідаверыя. Праўда мястовае насяленне адносьне вартасьці гэтых грошай і роунасьці іх з нямецкімі плацежнымі спосабамі было даволі азнаемлено, але у весцы, на жаль, панавала вялікае нізнанне гэтых грошай і гэта акалічнасьць часта была выкарыстана на убытках селян. Цяпер усе гэтыя сумлеукі адсунуты. Вышэй паданыя словы аб гасударственнай гаранціі так падабраны, што, самыя нідаверчывыя і ліхаемныя ні могуць сумлевацца у гасударственнай гаранціі. Грошы Oberost цяпер і сваім узверхнім выглядам рауняюцца кожнаму другому нямецкаму способу аплаты. У плацежным руху новыя крэдыткі па вартасьці сваей маюць такое-ж аднашэнне да нямецкіх грошай, г. з.: адна крэдытка Пазычковай Кассы Ostu на 1 рубель=роуна крэдытцы Пазычковай Кассы на 2 маркі=роуна нямецкай крэдытцы на 2 маркі.

Нейкі час будуць пускацца у рух як новыя так і старыя «Darlehyskassenschein'y.» Выкуп і спын карыстання быушых грошай Oberost такім парадкам, што падавацель замест быушаго нямецкаго рубля атрымае крэдытку Пазычковай Кассы на 2 маркі, пачнецца тады толькі, як новыя грошы будуць выпушчаны у дастатачным ліку. Такім парадкам валадзелец быушых рублеу ні мае патрэбы ніпакоіцца, а наадварот, ен можа спакойна карыстацца і цяпер гэтымі рублямі пры плацежах прыватнаго і публічнаго характэру асабліва пры зносінах с публічныімі кассамі. Калі пачнецца выкуп і спын карыстання старых грошай, то перыод выкупу будзе такі доугі, што кожын найдзе магчымасьць выкупіць свае рублі. Перыод гэты па меньшай меры будзе 6 мнсячны, а дзеля таго, каб кожын без ніякіх турботау мог выкупіць грошай, будзе своечасна аб гэтым апавешчано і з гэтай жа мэтай наладжано многа меняльняу.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Вечар с танцамі картамі і лото уладжывае Дзетцікі лекарна-пітацельны атрад У З. С. заутра, 17 жніуня у «Беларускай Хаце» на карысьць атраднаго прытулку. Будзе пастаулена «Цетка вінавата». Хор Цераускаго выпоуніць рад нацыянальных беларускіх песьняу.

Таварыство ахраны памяткау польскай старасьвеччыны, у постаці членау упраулення Ельскаго і Трэпко, адмовіла Беларускай Краевай Выстауцы у экспонатах с свайго музэю у гмаху домініканскаго касьцелу. Гэтое Т-во дазволіло толькі аддзельным сваім членам дастауленне экспанатау.

С б. віленскай выстаукі гэтымі днямі будуць дастаулены Бел. Краевай Выстауцы цікавыя экспонаты дырэктарам віленскай бібліатэкі і музэю доктарам археалегіі і Іпполем.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 14 жніуня. 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Усьпешныя перэдавыя стычкі паміж рэкамі Ізэр і Скарп. Паудневей Мэрры і паудневей рэкі Ліс варожыя атакі усьпеха ні мелі.

Група арміі гэнэрала-палкоуніка фон Бэна.

Па абедзьвым старанам Соммы і паупочней Ауры часьцічныя баі. Захадней і паудпева—захадней Ласіпні вораг зноу атакавау нашыя распалажэння. Варожая атака была разьбітой нашым агнем па абедзьвум старанам Капні. Далей да поудня мы контр атакай адбілі ворага.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Ля рэкі В л. і усходней Рэймса дробныя пяхотныя стычкі. Лейтэнант Болле меу сваю 30. Обэр-лейтэнант Лерцэр сваю 29 і лейтэнант Рэт сваю 20 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Беларускі вучыцельскі інстытут. Прыбыушыя з Яраслауля ад эвакуаванаго у 1915 г. менскаго вучыцельскаго інстытуту, зьвярнуушыся да Беларускаго Народ. Сэкрэтарыяту па пытанню аб найхутчэйшым звароці інстытуту у Менск спаткалі поунае спадчуванне, знаходзючы гэта вельмі патрэбным і пажаданнем, тым болей што некаторыя з расійскіх мест, хочучы перэцягнуць інстытут да сябе, рабілі яму выгодныя прэпанаванні. У культурна - асьветнай камісіі Бел. Рады есьць праэкт расходнай сьметы на інстытут па якому да каляд інстытуту авансыруецца 50,000 руб., пры чым нямецкія уласьці нічога ні маюць проціу звароту інстытуту у Менск.

Зварот цэркві. Цэркау м. Мура Навагр. пав, пераробленым гвалтоуным чынам у касьцел, с помаччу нямецкіх уласьцей звернена, паводлуг вестак кансысторыі, праваслаунаму духавенству.

Да прыезду р.-к. епіскапа. Прыбыушы 14 жніуня вечэрнім поездам Л. Р. ж. д. зноу назначаны р.-к. еп'скап Лазінскі быу спатканы на Саборным пляцу меськім галавою Хржонстоўскім, сказаушых слово вітання.

У земстві. У Бегамельскую вучэбна - рамесную земскую майстэрню у канцы жніуня адчыняецца прыем вучняу на сталярны і слесарна-кавальскі аддзелы. Усяго есьць дзеля нідахвата грошай 9 вакансый.

Запрашэнне. У Бел. Нар Сэкрэтарыят загадчыкам спра вачн. аддзелу па народнай ась веце запрашаны А. Смоліч.

Інстытут прышчэпліванния во пау магілеускаго павятова земства, па весткам губ. зе управы, уладжэны па наве шаму палепшанаму тыпу, п водлуг усіх навуковых запа рэб з найлепшымі прысп сабленнямі і бактэрыялягічна лабараторыяй.

Воспеная вакціна «пэтры адпускаецца толькі пасьл бактэрыялагічнаго кантрол праверкі і спробы, як на ст пень прышчэпкі так і на до рату васпін. Одпуск па свай кошту. Інстытут знаходзіцца Магілеві па Днепраускай ву д. № 86.

У земстве. Падрахунак касс губ. земуправы, зроблены а баупоунамоцнымі нямецкіх ул сьцей закончыцца у хутк часе. Кассавыя справы паку што у поуным парадку. Пасьля аканчання падрахун усе грошавыя земскія уклад будуць ісьці у губ. казнач ство.

Рэдактар **А. Пр шински.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынбляга.